## Як узнік беларускі этнас?
## Інтэграцыя беларускай літаратуры і гісторыі

**Л. А. Рабчынская,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэшай катэгорыі
**Н. Г. Галушка,**
настаўнік гісторыі вышэшай катэгорыі

**Тэма ўрока: Фарміраванне беларускага этнасу**

**Мэта:** засваенне ведаў пра працэс утварэння беларускага этнасу.

**Умець:** суадносіць гістарычныя з'явы; аналізаваць, абагульняць, параўноўваць, тлумачыць гістарычныя факты; выяўляць асаблівасці; параўноўваць і супрацьстаўляць розныя ідэі, падыходы, канцэпцыі развіцця гістарычнага працэсу; самастойна працаваць з гістарычным тэкстам, падбіраць літаратурныя творы, выкарыстоўваць веды з беларускай літаратуры; працаваць у групах.

**Ведаць:** складванне этнічнай тэрыторыі; рысы менталітэту беларусаў; сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя ўмовы ўтварэння беларускага этнасу.

**Выхоўваць:** пачуццё нацыянальнага гонару да гісторыі і культуры беларускага народа; фарміраваць нацыянальную самасвядомасць.

**Тып урока:** засваенне новых ведаў.

**Форма ўрока**: інтэграваны ўрок гісторыі Беларусі і беларускай літаратуры.

**Асноўныя паняцці**: этнас, менталітэт, самасвядомасць.

**Афармленне ўрока:** электроная прэзентацыя краявідаў Беларусі, архітэктурных помнікаў, партрэтаў гістрычных дзеячоў; карта, выстава кніг.

### Ход урока

### І. Уступная гутарка настаўнікаў з вучнямі

*Гучыць песня «Спадчына» (музыка Ігара Лучанка, словы Янкі Купалы, выконвае ВІА «Песняры»). Ідзе электроная прэзентацыя.*

**Настаўнік гісторыі.** Тэма ўрока – утварэнне беларусская народнасці. Мы – беларусы. Як узнік наш этнас? Выкарыстоўваючы веды па грамадазнаўству, беларускай літаратуры і гісторыі Беларусі, мы будзем даследаваць гэты працэс. Прааналізаваць гісторыю ўтварэння народнасці, вызначыць прыкметы народнасці, умовы ўтварэння і асаблівасці.

1. Дайце вызначэнне гэтаму паняццю (па грамадазнаўству). (*Грэчаскае паходжанне, абазначае «народ», «народнасць«».*)
2. Якія этапы вылучаюць у этнічным працэсе? (*Род, племя, этнас, нацыя.)*

3. Які час ахоплівае працэс утварэння этнасу? (*Усё сярэднявечча, да развіцця капіталізму, XIII-XVI стст.)*

4. Па праблеме паходжання беларускага этнасу існуе некалькі гіпотэз, канцэпцый. Назваць гэтыя гіпотэзы і растлумачыць іх сутнасць. (*Апераджальныя заданні вучням, электроная прэзентацыя*.)

| Канцэпцыі паходжання беларускага этнасу | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Баліцкая | Крывіцкая | Крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкая | Старажытна-руская | Заходнеруская | Польская і велікаруская | Фіна-угорская |

**II. Вывучэнне тэмы**

❒ **Фарміраванне этнічнай тэрыторыі**

**Настаўнік гісторыі.** Мы ведаем, што такое этнас. Па гэтаму паняццю вызначыць галоўныя рысы народнасці. (тэрыторыя, мова, культура, самасвядомасць, менталітэт, побыт).

*Самастойная праца па тэксту першага падзагалоўка § 26.*

<u>Заданне.</u> Вызначыць і паказаць на карце, як адбывалася фарміраванне этнічнай тэрыторыі беларусаў. Адзначыць мяжу гэтай тэрыторыі. (на поўначы– Браслаўскія азёры).

**Настаўнік гісторыі.** Якія асаблівасці склаліся на поўначы пры фарміраванні тэрыторыі? (доўгі час у памежжы пражывала змашанае насельніцтва: беларускае і літоўскае; у Аўкштайціі, Троках, Вільні – шмат беларусаў; у Талочыне – шмат літоўцаў).

Заходняя мяжа – тэрыторыя, якая ўсаталявалася пасля Крэўскай уніі. Асаблівасць: заходняе Падляшша (прымыкала) да Гродзеншчыны і Берасцейскай зямлі, пражывалі беларусы, палякі, літоўцы, яцвягі, украінцы.
Да Люблінскай уніі межы не былі акрэслены, Жыгімонт II Аўгуст асабістым загадам далучыў Падляшша да Каралеўства Польскага.

Паўднёвая мяжа – Палессе – геаграфічна размежавала тэрыторыю з Украінай па рацэ Прыпяць і яе паўднёвым прытокам.

Найбольш зменлівымі ў XIV-XVI стст. былі ўсходнія межы ВКЛ. У перыяд найбольшай магутнасці ВКЛ у яго склад уваходзілі бранскія, смаленскія і іншыя землі. Асаблівасць: на фарміраванне этнічнай тэрыторыі ў цэлым аказвала ўплыў каланізацыя і таму асабліва ў памежжы насельніцтва была шматэтнічным, а беларускія тэрыторыі ў складзе ВКЛ у тры разы пераўзыходзілі літоўскія.

**Настаўнік беларускай літаратуры.** Пісьменнік У. Караткевіч у творы «Зямля пад белымі крыламі» вылучыў шэсць вялікіх рэгіёнаў. Назавіце гэтыя рэгіёны. (*Паазер'е, Цэнтральная Беларусь, Панямонне, Падняпроўе, Заходняе Палессе, Усходняе Палессе.*)

*Вучань чытае верш «Беларуская песня» Уладзіміра Караткевіча:*

*Дзе мой край? Там, дзе вечную песню пяе Белавежа.*
*Там, дзе Нёман на западзе помніць варожую кроў.*
*Дзе на ўзвышшах наваградскіх дрэмлюць суровыя вежы*
*І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокій Дняпро.*
*Ты ляжыш там, дзе сіняя Прыпяць ласкава віецца,*
*Дзе Сафія плыве над Дзвіною, нібы карабель…*

Заданне. Параўнайце з сучаснай тэрыторыяй Беларусі.

## ❒ Грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы фарміравання беларускай народнасці

Заданне. Працуючы з падзагалоўкам II, III запоўніць табліцу «Умовы фарміравання беларускага этнасу».

| *Умовы* | *Пазітыўныя* | *Негатыўныя* |
|---|---|---|
| Сацыяльна-эканамічныя | Складваецца саслоўна-класавая структура.<br>Агульныя рысы гаспадарчай дзейнасці.<br>Гандаль. і Магдэбургскае права | Саслоўныя прывілеі.<br>Прыгонніцтва |
| Грамадска-палітычныя | Аб'яднанне беларускіх зямель і ўтварэнне дзяржавы ВКЛ.<br>Самастойнасць Полацкай, Віцебскай і іншых зямель.<br>Цэнтралізатарская палітыка Вітаўта.<br>Росквіт магутнасці ВКЛ | Сепаратыстскія тэндэнцыі.<br>Войны і грамадзянскія войны |
| Духоўныя | Веравызнанне. Да XVI ст. праваслаўе было прыкметай беларускага насельніцтва.<br>Развіццё культуры, асабліва ў эпоху Адраджэння.<br>Беларуская мова – дзяржаўная мова | Раскол жыхароў на праваслаўных і каталікаў.<br>Палітыка акаталічвання |

## ❒ Фарміраванне беларускай мовы

**Настаўнік беларускай літаратуры.** У XIV-XVI стст. складваюцца фанетычныя, лексічныя і сінтаксічныя асаблівасці беларускай мовы.

Заданне. Вызначыць асаблівасці беларускай мовы. Скласці схему. Прывесці прыклады.

| Асаблівасці беларускай мовы | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Дзеканне<br><br>*радзіма, дзед* | Цеканне<br><br>*цётка, жыццё* | Аканне<br><br>*нага, вада* | Яканне<br><br>*зямля, вясна* | Зацвярдзелыя гукі<br>*дождж, рэха, жыта* | Прыстаўныя гукі<br>*вуха, восень, гісторыя* | Гукі й, ў<br>*гай, ваўкі* |

**Настаўнік беларускай літаратуры.**
*Якія знаёмыя назвы і словы,*
*Якая цудоўная родная мова!*
*І ўсё мілагучна для слыху майго:*
*І звонкае «дзе», і густое «чаго»!*

Па мілагучнасці беларуская мова другая ў свеце пасля французскай.

**Настаўнік гісторыі.** Насельніцтва ў ВКЛ было шматэтнічным. А дзяржаўны статус старабеларускай мовы садзейнічаў яе ўзбагачэнню з іншых моў.

<u>Заданне.</u> Прывесці прыклады запазычання з з іншых моў.

Паланізмы (бруд, кабета, моц, пан, праца, хлопец).

Лацінізмы (адукацыя, аркуш, водар, гонар, гумар, колер).

Літуанізмы (дойлід, клуня, свіран).

Нямецкія словы (гвалт, дах, ланцуг, ліхтар, фарба, цыбуля).

**III. Замацаванне тэмы**

- **Этнічная самасвядомасць. Паходжанне назвы «Белая Русь»**

**Настаўнік гісторыі.** У дачыненні да насельніцтва Беларусі ўжываліся розныя назвы-этнонімы.

<u>Заданне.</u> Назваць найбольш пашыраныя назвы. (*Ліцвіны, русіны, рускі народ, беларусцы.*) Растлумачыць гэтыя саманазвы насельніцтва Беларусі.

Складсці храналагічны план «Гісторыя назвы Белая Русь».

1. XIII ст. – самы ранні тэрмін «Белая Русь» выкарастаны ў лацінскай форме «Alba Russia», знойдзены ў Дублінскім рукапісе «Ірландыя». Мае на ўвазе тэрыторыю сучаснай паўночна-заходняй Беларусі.
2. 1381 г. – «Хроніка Польшчы», упамінаецца Полацк як крэпасць Белай Русі.
3. Да канца XV ст. тэрмін «Белая Русь» адносіцца да Ноўгарада і Пскова (лацінскія і нямецкія звесткі).
4. 1461 г. – самы стары помнік усходнеславянскага паходжання, у якім упамінаецца Белая Русь у Ноўгарадзе.
5. З канца XV ст. тэрмін «Белая Русь» вядомы ў ВКЛ, ён адносіцаа да Маскоўскай дзяржавы і Ноўгарада.
6. Сярэдзіна XVI ст. – тэрмін «Белая Русь» адносіцца да Полаччыны («Гісторыя палякаў», Марцін Кромер).
7. XVII-XVIII стст. – канчаткова замацоўваецца за ўсходняй тэрыторыяй Беларусі.

8. XVIII ст – у Расійскай імперыі Белай Руссю называюць землі, далучаныя па першаму і другому падзелу Рэчы Паспалітай, гэта цэнтр і ўсход Беларусі.
9. З XIX ст. тэрмін «Белая Русь» выкарыстоўваецца як назва ўсёй краіны.

Лакалізуйце тэрыторыю Русі і Літвы на картасхеме.

Ахарактэрызуйце паходжанне назвы «Белая Русь». Складзіце схему версій паходжання назвы «Белая Русь».

| Версіі паходжання назвы «Белая Русь» | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Усходні напрамак свету | Колер адзення, валасоў, твару | Хрысціянская праваслаўная вера | Незахопленая, свабодная частка тэрыторыі | Прывілеяванае становішча Полацкай і Віцебскай зямель |

**Настаўнік беларускай літаратуры.** Фарміраванне беларускай народнасці праявілася ў складванні асобнага псіхічнага складу і своеасаблівага менталітэту.

<u>Заданне.</u> Прачытаць верш Рыгора Барадуліна «Мы больш сваёй ахвярнасцю вядомы».

*Мы больш сваёй ахвярнасцю вядомы.*
*Мы, беларусы, мы – народ такі.*
*Ахвотна забываем, што мы,*
*Хто мы.*
*Згадаюць*
*Нашай памяці вякі!*

*Мы сціпласцю сваёй здаўна вядомы,*
*Саміх сябе хваліць нам не з рукі.*
*Хай слабакі*
*Аж падаюць ад стомы,*
*На плечы ўзяўшы*
*Пыхі мех цяжкі.*

*Мы ўсім сваёй гасціннасцю вядомы,*
*Надзейныя сябры і дружбакі.*
*І госць, і падарожны ў нас,*
*Як дома.*
*А злым і травы колюцца ў бакі.*

*Гатовы ўсё аддаць –*
*І тым багаты,*
*Мы , беларусы,*
*Мы – народ такі.*

*Што з краю небяспекі – нашы хаты,*
*Пра гэта*
*Не забудуць чужакі.*

Заданне. Прывесці прыклады нацыянальных рыс беларусаў. Вызначыць фактары, якія ўплывалі на фарміраванне ментальнасці беларускага народа. Даказаць, што беларускі этнас у асноўным склаўся к канцу XVI ст.

**Настаўнік беларускай літаратуры.** Даследаваўшы гісторыю ўтварэння беларускага этнасу, выкажыце свае думкі і адносіны праз вершы. Што для вас значыць гісторыя беларускага народа і гісторыя нашай айчыны?

Дзяды і прадзеды, якія вы?
І дзе, скажыце,тая ніць,
Якую ў спадчыну пакінулі,
Каб ей вякі навечна зліць?

І што цяпер вам можа сніцца,
Калі я тут пад шум травы,
Звіню танюсенькаю ніццю
Між мёртвым светам і жывым.
*Анатоль Сербантовіч*

Мой родны кут,
Як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!
Не раз утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае ўбогай
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю.
*Якуб Колас*

Кожны з нас прыпасае Радзімы куток,
Каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны –
Дым над хатай, снапамі прыціснуты ток,
Матчын спеў і гароды, прапахлыя кмінам…
*Пімен Панчанка*

Край легенд,
Адвечных песень-казак,
Крайц паэм –
Бальзам жывых крыніц…
Край балот,
Тугі, азёраў наскіх,
Край цішы і громаў навальніц…

Край лясоў, мінулых дзён пастання,
Край нізін –
Прастораў дальніх шыр…
Край палёў.
*Паўлюк Трус*

З цемрай, за сталлю,
З хлуснёй крывадушнай ішлі,
Але і Зямля, і Вада, і Дабро
Скаранялі той зброд…
Будуць давеку крыніцы
На гэтай зямлі,
Будзе давеку наш мужны і мудры вялікі народ.
*Уладзімір Караткевіч*

Я хаджу, закаханы ў твае краявіды,
І шапчу, як прызнанне:
«О, мой край дарагі!».
Зноў нясу табе ў споведзь
І трывогі, і крыўды, і надзеі,
І ўцехі, і любоў, і грахі.
*Ніл Гілевіч*

Магутны Божа! Уладар сусветаў,
Вялізных сонцаў і сэрц малых,
Над Беларусяй ціхай і ветлай
Рассып праменне Свае хвалы.

Дай спор у працы будзённай, шэрай
На хлеб штодзённы, на родны край
Павагу, сілу і веліч веры
У нашу праўду, у прышласць – дай!

Дай урадлівасць жытнёвым нівам,
Учынкам нашым пашлі умалот,
Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай
Краіну нашу і наш народ.

Пакуль сонца не згасне,
Пакуль свецяць зоры,
Беларусь не згіне,
Будзе жыць
Беларусь! *Наталля Арсеннева*

Мы больш сваёй ахвярнасцю вядомы.
Мы, беларусы, мы – народ такі.
Ахвотна забываем, што мы,
Хто мы.
Згадаюць
Нашай памяці вякі!

Мы сціпласцю сваёй здаўна вядомы,
Саміх сябе хваліць нам не з рукі.
Хай слабакі
Аж падаюць ад стомы,
На плечы ўзяўшы
Пыхі мех цяжкі.

Мы ўсім сваёй гасціннасцю вядомы,
Надзейныя сябры і дружбакі.
І госць, і падарожны ў нас,
Як дома.
А злым і травы колюцца ў бакі.

Гатовы ўсё аддаць –
І тым багаты,
Мы , беларусы,
Мы – народ такі.
Што з краю небяспекі – нашы хаты,
Пра гэта
Не забудуць чужакі.
*Пімен Панчанка*

- **Віктарына**

**Мая Беларусь**

**І тур «Мая Беларусь»**

1. Чаго ў Беларусі больш – рэк ці азёр?
2. Назавіце самую вялікую раку Беларусі.
3. Назавіце самае буйное возера Беларусі.
4. Якая птушка з'яўляецца крылатым сімвалам Беларусі?
5. Назавіце старажытныя сталіцы Беларусі.
6. Назавіце старажытнейшы горад Беларусі.
7. ВКЛ – дзяржава ад мора да мора.  Чаму?
8. Як называецца земляны насып на старажытныя магілы?
9. Як называлася рэлігія славян да з'яўлення хрысціянства?
10. Назавіце адну са старажытнейшых цэркваў у Беларусі, у сцены якой умараваны збаны-галаснікі.
11. Як называецца выдатны помнік абарончага дойлідства, збудаваны майстрам Алексам?

**ІІ тур «Гонар нацыі»**

1. Полацкая княжна, асветніца, ігумення сабора Святога Спаса ў Полацку, першая жанчына на Русі. Якая была кананізавана ў святыя, унучка Усевалада Чарадзея.
2. Епіскап, знакаміты пісьменнік і прапаведнік, царкоўны дзеяч. Яго творы – вяршыня развіцця ўсходнеславянскай грамадска-палітычнай думкі XI ст.
3. Полацкі майстар, ювелір, які вырабіў крыж па заказу полацкай княжны Еўфрасінні як узор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі.
4. Беларускі паэт-гуманіст эпохі Адраджэння, пісаў на лацінскай мове, аўтар паэтычнага твора «Песня пра зубра».
5. Беларускі і ўсходнеславянскі друкар, гуманіст, вучоны, пісьменнік эпохі Адраджэння. Яго асветніцкая дзейнасць вызначыла спецыфіку беларускай культуры, далучыла яе да еўрапейскай культуры.
6. Знакаміты дзяржаўны дзеяч сярэдневечнай Беларусі, юрыст, пісьменнік публіцыст, канцлер ВКЛ, аўтар Статута 1588 г.
7. Знакаміты полацкі князь, аб якім існавала легенда, што ён мог ператварацца ў ваўка і з’яўляцца там, дзе яго не чакаюць.
8. Першы летапісна вядомы князь Полацка.
9. Як звалі героя Аршанскай бітвы ў вайне з Маскоўскай дзяржавай 8 верасня 1514 г., які узначаліў войскі ВКЛ?

**III тур «Імя ў гісторыі»**

1. Князь ВКЛ і кароль Польшчы. Час яго кіравання называюць залатым векам нашай гісторыі. Атрымаў мянушку Стары за тое, што задоўга да смерці аформіў передачу свайму сыну Вялікага Княства.
2. Паспяхова змагаўся з крыжакамі. Абараняў Наваградак, з войскамі даходзіў да прускіх зямель. Быў здрадніцкі забіт мазавецкім рыцарам, пахаваны недалёка ад Калажанскай царквы.
3. Прэтэндэнт на трон Вялікага князя, удзельнік Кулікоўскай бітвы на баку Маскоўскага князя.
4. Пераемнік і сын першага князя ВКЛ, заснаваў каля Наваградка Лаўрышаўскі манастыр.
5. Князь-воін, які ўсё жыццё правёў у ваенных паходах, умацоўваючы ВКЛ. Каля Гародні ён рассяліў прусаў, што ўцяклі ад крыжакоў.
6. Імя князя, які перанёс сталіцу з Наваградка ў Вільню.
7. Імя князя, які амаль у два разы павялічыў уладанні ВКЛ за кошт далучэння Кіеўшчыны, Чарнігаўшчыны, Браншчыны, Севершчыны.
8. Імя князя, які ў бітве каля Сініх вод разбіў татар.
9. Хто з беларускіх князёў першым займаў адначасова пасаду Вялікікга князя ВКЛ і караля польскага.
10. Назавіце імя кіраўніка войск ВКЛ падчас Вялікай вайны.

**IV. Падвядзенне вынікаў урока. Выстаўленне адзнак**